Несур'ёзна пра сур'ёзнае

Уладзімір Цанунін

# Самі пра сябе

Гумарыстычныя вершы

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2022

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
Ц16

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Рэдакцыйны савет:
*А. М. Зэкаў, К. В. Камейша,*
*Л. Ф. Анцух, В. А. Губараў, А. В. Кубышкіна*

**Цанунін, У. Я.**
Ц16 Самі пра сябе : гумарыстычныя вершы / Уладзімір Цанунін. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2022. — 120 с. — (Несур'ёзна пра сур'ёзнае).
ISBN 978-985-581-510-6.

Жыццё чалавека часам напаўняецца непрыемнасцямі, стрэсамі, якія псуюць нервы і пагаршаюць стан здароўя. У такой сітуацыі нават заморскія лекі прыносяць мала карысці. Яшчэ ад прадзедаў усім вядома, што жарт, выпадкова пачуты ранкам, можа ўзняць настрой на цэлы дзень і нават дапаможа справіцца з праблемамі, што здаваліся невырашальнымі. Даўно даказана: смех — стымул жыццядзейнасці, смяяцца трэба і для здароўя. Чытаючы дасціпныя радкі з кнігі Уладзіміра Цануніна «Самі пра сябе», вы ўпэўніцеся ў гэтым.

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-510-6**

© Цанунін У. Я., 2022
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2022

# Пра кабет у абед

***

Ноч не спала, паднялася рана,
Бо балелі моцна ўсе вантробы.
Інгалятар зблытала з кальянам...
І забыла на ўсе свае хваробы.

***

Пытанне гэта без прычын
Душу маю кранула…
Чаму мы будучых жанчын
Шукаем у мінулым?

***

Стан вельмі прыгожы жаночы!
Спаднічкі кароткай прыпол
Прысніўся мне восеньскай ноччу...
Да ранку смактаў валідол.

***

Касіць з гадоў дванаццаці пачаў —
Спачатку ў школе, потым на рабоце…
Касіў, бывала, днямі з-за пляча
І знемагаў пасля ў салёным поце.

Касіў у чыстай ранішняй расе,
У белы дзень і нават цёмнай ноччу...
Пакуль нарэшце сам не акасеў
Ад ножак стройных і спадніц дзявочых.

***

Нідзе ніколі не рабіла,
Тытунь курыла і піла.
І назаўсёды страх згубіла,
Бо вельмі страшнаю была.

***

Злуюся на людзей худой пароды,
Бо вельмі паважаю пірагі.
З'ядаю, нібы птушачка, заўсёды
За дзень палову ўласнае вагі.

***

Сусед сказаў: «Сягоння з сынам
Запусцім змея мы нарэшце.
Ён узляціць высока ў неба!
Так робім мы не першы год».
Пачуў адказ ён праз хвіліну:
«А я адпраўлю заўтра цешчу.
І панясе яе, як трэба,
У неба белы самалёт!»

***

Спытаў аднойчы сябра мой
У мудрага суседа Колькі:
«Як адпачыць усёй сям'ёй,
Калі адна пуцёўка толькі?»

Яму разважлівы сусед
Параіў нечакана лоўка:
«Ты на цягнік купі білет
І цешчы падары пуцёўку».

***

Гуляе Мурка ў хованкі з Султанам,
Умовы ставіць, аблізнуўшы лапу:
«Знайдзі мяне — і я тваёю стану.
Калі не знойдзеш — буду пад канапай».

***

Спачатку кветкі, абяцанні…
Празрысты вэлюм з цёплым ветрам...
А потым дзікі храп уранні
І сапсаванае паветра.

***

З работы муж прыйшоў сягоння рана,
Але чамусьці быў занадта злы.
Ён запытаў у жонкі нечакана:
«Скажы, а колькі год жывуць казлы?»

Жанчына моўчкі хату падмятала,
Развешвала бялізну на трубе…
І потым абыякава спытала:
«А што, ужо нездаровіцца табе?»

***

Калі прыкмеціш, што ў тваёй каханай
У зрэнках безліч іскарак жыве,
То ведай, што спраўляюць тараканы
Баль у яе прыгожай галаве.

***

У нашай ветлячэбніцы раённай
Уранку тэлефон загаласіў.
Мужчынскі голас з трубкі тэлефоннай
Ветэрынара ціха папрасіў:

# Пра аўтара



Уладзімір Яфімавіч Цанунін нарадзіўся 1 ліпеня 1954 г. у в. Батвінаўка Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1975 г. пасля заканчэння гістарычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута настаўнічаў у в. Святая Воля Івацэвіцкага раёна. Працаваў у Чавускім раёне, затым — у Крычаўскім вучылішчы меліярацыі. У 1980-я гг. пераехаў у родную вёску, дзе жыў да аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Пазней як перасяленец працаваў у в. Папялёва на Пружаншчыне. У 1995 г. па выніках конкурсу быў запрошаны ў беларуска-германскае дабрачыннае прадпрыемства «Надзея — XXI стагоддзе», створанае для аздараўлення дзяцей-чарнобыльцаў. Працаваў настаўнікам гісторыі і кіраўніком гуртка «Работа з дрэвам».

Вершы і песні пачаў пісаць у пачатковай школе. Упершыню творы У. Цануніна пабачылі свет у 1967 г. у часопісе «Бярозка».

Аўтар паэтычных зборнікаў: «У струменях часу», «Хто ж адкажа», «Пушчанскія галасы», «Да вогнішча далёкага юнацтва», «Люстэрка», «Страчанае рэха», «Кліча бацькава хата», «Зачараваная чаромха», «Белыя галубы над Сафіяй», «Жорны лёсу», «Каму патрэбна памяць аб вайне»; суаўтар шматлікіх калектыўных зборнікаў: «Край верасовы», народнага

клуба самадзейных паэтаў і кампазітараў «Жывіца», вілейскага літаратурнага аб'яднання «Натхненне». У 2010 г. напісаны У. Цануніным вершаваны тэкст да фільма «Горад на Вяллі» заняў першае месца на конкурсе дакументальнага кіно. Вершы перакладаліся на рускую, нямецкую, англійскую, азербайджанскую і ўкраінскую мовы. Пераклад на польскую мову ўвайшоў у анталогію «Масты: Мінск – Варшава».

Член народнага клуба самадзейных паэтаў і кампазітараў «Жывіца», вілейскага літаратурнага аб'яднання «Натхненне», Беларускага саюза музычных дзеячаў, Саюза пісьменнікаў Беларусі. Уваходзіць у народны калектыў аўтарскай песні «Элегія», які з'яўляецца лаўрэатам нацыянальных і міжнародных фестываляў.

Лаўрэат Мінскай абласной прэміі ў галіне літаратуры ў намінацыі «Паэзія» — прэмія імя Максіма Багдановіча. Узнагароджаны медалём «За вялікі ўклад у літаратуру».

Жыве ў г. Вілейцы.

# Змест

Пра кабет у абед . . . 3
Лёс такі, мужыкі! . . . 20
Прыколы каля школы . . . 43
Думкі ў задворку . . . 50
Байкі на прыродзе . . . 64
Пра людзей у пагонах . . . 69
Э, а я! . . . 74
Свята (*гумарыстычная паэма*) . . . 83
Лімэрыкі не з Амерыкі . . . 97
Усход — справа тонкая . . . 107
Што ў нас выходзіць з-пад пяра… . . . 111

*Пра аўтара* . . . 117